Источник: "Мінская праўда" - 2013-09-28

# ТРЭЦІ ЎРАДЖАЙ ЗА ЎСЮ ГІСТОРЫЮ

**Так ахарактарызаваў вянец сёлетняй работы першы намеснік старшыні Нясвіжскага райвыканкама — начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Анатоль Драгавец: трэці раз ураджайнасць перавысіла 60 ц/га. У раёне намалочана 134,3 тыс. тон зерня. Гэта адзін з лепшых паказчыкаў у вобласці. Сёлета Нясвіжскі раён будзе ў ліку перадавікоў на «Дажынках». Насуперак складаным умовам надвор'я, самаадданая праца хлебаробаў дала свой плён. Сярод тых, хто змагаўся за гэты ўраджай і дабіўся значных вынікаў, стаўшы пераможцамі ў рэспубліканскім спаборніцтве, дырэктар ААТ «Сейлавічы» Сяргей Пілішчык, галоўны аграном ААТ «17 Верасня» Аляксандр Макарэвіч і галоўны інжынер ААТ «Лань — Нясвіж» Міхаіл Ігнатовіч, якія запрошаны на рэспубліканскія «Дажынкі». Яны расказалі карэспандэнту «МП» пра складнікі поспеху.**

**Святлана ХОРСУН.**

## Аляксандр Макарэвіч: Трымаем марку



— Наша гаспадарка заўсёды ў ліку лідараў, а таму ўсе мы прывыклі, як кажуць, трымаць марку — той дастойны ўзровень працы, які звычайна прыносіць поспех. Да таго ж побач агракамбінат «Сноў» — можна сказаць, волат сельскагаспадарчай вытворчасці Міншчыны, дзе ў свой час працаваў галоўным аграномам Уладзімір Бабёр — адзін з вядомых на ўсю рэспубліку спецыялістаў. Падтрымлівае нас і кіраўнік гаспадаркі Андрэй Коктыш — патрабавальны, разважлівы, паважае чалавека працы. Людзі гэта цэняць і стараюцца працаваць як мага лепей, адной камандай. На пасадзе агранома я сёмы год. За апошні час шмат пазітыўных змен адбылося і ў нашай гаспадарцы. З'явілася передавая тэхніка, сучасныя пасяўныя агрэгаты, якія дапамагаюць дабівацца важкіх ураджаяў. З'явілася і добрае насенне. Высяваем новыя перспектыўныя сарты. Наладжана цесная сувязь з Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтрам па земляробству НАН Беларусі, Гродзенскім сельскагаспадарчым універсітэтам. Выязджаем на семінары па земляробству. І гэта дае свой плён. У бягучым годзе намалацілі 9 тыс. 694 тоны зерня. Самы высокі ўраджай дало трыцікале: на асобных участках — больш за 80 цэнтнераў з гектара, ёсць і па 98—97 цэнтнераў. Мы збіраем добрыя ўраджаі і пшаніцы, і ячменю. Калі зямлю даглядаеш як след, яна абавязкова табе аддзячыць. Я нарадзіўся і вырас на гэтай зямлі. Тут працавалі і мае бацькі: маці — у паляводстве, бацька — у жывёлагадоўлі. І я не маю права працаваць дрэнна. Трымаць марку — наш абавязак.

## Сяргей Пілішчык: Разумныя амбіцыі — не перашкода для поспеху



— Сёлета ў нашай гаспадарцы ААТ «Сейлавічы» атрымалі неблагі ўраджай: 65,5 ц/га, але я памятаю і іншыя вынікі. Працую ў гэтай гаспадарцы ўжо дзявяты год. Пачыналі з 30 цэнтнераў, радаваліся, калі збіралі на 10 цэнтнераў больш (на жаль, землі нашы не вельмі прадуктыўныя), а сёння наш ураджай ужо памножыўся больш чым удвая: гэта, безумоўна, радуе, але яшчэ не мяжа: разумныя амбіцыі — не перашкода для поспеху. Гаспадарка наша — сярэднестатыстычная: 3.700 га сельгасугоддзяў, 2.500 га — ворыва, тры малочнатаварныя фермы, свінатаварны комплекс на 7 тыс. галоў, 900 адзінак дойнага статка. Спецыялізуемся на вырошчванні цукровых буракоў і рапсу. Вырошчваем таксама кукурузу і люцэрну. Рэгулярна здаём дзяржаве вялікія аб'ёмы харчовай пшаніцы, па 1.200—1.500 тон піваварнага ячменю і заўсёды маем за гэта неблагія грошы. Адпаведна, мы можам выплачваць нашым людзям і добрую прэмію і дастойную зарплату. У апошні час нашы здабыткі стабільныя: у нас з'явіліся новыя пасяўныя агрэгаты, энерганасычаныя трактары, сучасныя камбайны. Змяніліся падыходы і ў рабоце з угнаеннямі, сёння аддаём перавагу арганіцы. Здадзена новая малочнатаварная ферма з даільнай залай, праектуецца яшчэ адна, рабатызаваная, на 500 галоў. Ездзім у перадавыя гаспадаркі рэспублікі за вопытам. Давялося таксама пабываць у Польшчы, Германіі. Імкнёмся ісці ў нагу з часам, каб быць сярод лепшых.

## Міхаіл Ігнатовіч: Пасябраваў з камбайнам яшчэ ў школе



— Я таксама тутэйшы: нарадзіўся ў Нясвіжскім раёне, у вёсцы Чанавічы. Упершыню пазнаёміўся з камбайнам у восьмым класе: быў памочнікам у нашага знакамітага камбайнера Анатоля Макаўчыка. Ён стаў маім настаўнікам, быў для мяне прыкладам адданасці хлебаробскай справе. Памятаю, як старанна рабіў я змазку механізмаў камбайна перад выхадам яго ў поле, як хваляваўся, калі ўпершыню падняўся ў яго кабіну. Я ўжо тады зразумеў: калі хочаш дабіцца поспеху — старайся.

Сёлета ў нашай гаспадарцы на ўборцы ўраджаю працавалі 11 збожжавых камбайнаў на плошчы 2.378 гектараў. Атрымалі 12.910 тон зерня. Працую ў гаспадарцы з 1984 года, на пасадзе інжынера — з 1997-га. За гэты час мы змаглі ўкамплектаваць свой калектыў кваліфікаванымі інжынерна-тэхнічнымі работнікамі. Працуюць людзі зладжана, старанна. Адной камандай. Ставіцца з разуменнем да нашых праблем і кіраўнік гаспадаркі. Калі трэба — заўсёды аператыўна выдзяляе патрэбную суму грошай, скажам, на рамонт. Усё гэта таксама дапамагае своечасова выконваць пастаўленыя перад намі задачы.

Святлана Хорсун. Трэці ўраджай за ўсю гісторыю